ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
26.06.2023 № 177

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Духоўная спадчына Беларусі (IX ст. – 1569 г.)» для VI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Духоўная спадчына Беларусі (IX ст. – 1569 г.)» (далей – вучэбная праграма) прызначана для VI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (далей – установы агульнай сярэдняй адукацыі) і накіравана на павышэнне эфектыўнасці работы па грамадзянскаму, патрыятычнаму і духоўна-маральнаму выхаванню вучняў.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 35 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень). Размеркаванне гадзін на вывучэнне матэрыялу з’яўляецца прыкладным. Педагагічнаму работніку дазваляецца самастойна размяркоўваць гадзіны з улікам навучальна-пазнавальных магчымасцей вучняў, уносіць пэўныя карэктывы ў працэсе рэалізацыі дадзенай вучэбнай праграмы.

3. Мэта – фарміраванне патрыятычных і духоўна-маральных якасцяў асобы вучня шляхам вывучэння духоўнай спадчыны Беларусі перыяду першых дзяржаўных утварэнняў на яе тэрыторыі і часоў Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ).

4. Задачы:

пашырэнне ведаў вучняў аб асаблівасцях духоўнага развіцця беларускага народа на працягу IX ст. – 1569 г.;

фарміраванне ў вучняў каштоўнасных адносін да сваёй Радзімы, выхаванне іх на традыцыях духоўнай спадчыны;

выхаванне ў вучняў павагі да нацыянальнай спадчыны, традыцый, культуры беларускага народа;

стварэнне ўмоў для развіцця творчай асобы, самаадукацыі.

5. Змест дадзенай вучэбнай праграмы прадугледжвае вывучэнне этнакультурнай спадчыны беларускага народа: мовы, абрадаў, звычаяў, сацыянарматыўных традыцый, каштоўнасцей духоўнай і матэрыяльнай культуры і пабудаваны на аснове кампетэнтнаснага падыходу. Далучэнне вучняў да духоўных і матэрыяльных набыткаў папярэдніх пакаленняў, разуменне і ўспрыняцце светапоглядных каштоўнасцяў продкаў ляжыць у аснове выхавання сапраўднага патрыятызму і пачуцця адказнасці за цяперашняе і будучае сваёй Бацькаўшчыны, фарміруюць павагу не толькі да ўласнай культуры, але і да этнічных традыцый іншых народаў, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі. З пазіцый кампетэнтнаснага падыходу змест дадзенай вучэбнай праграмы адрозніваецца большай інтэграванасцю, каштоўнасна-сэнсавай і практыка-арыентаванай накіраванасцю. Веды, уменні і навыкі застаюцца ў складзе гэтых патрабаванняў, але, зыходзячы з мэты адукацыі, яны ператвараюцца ў сродак развіцця. Якасць кампетэнтнаснай падрыхтоўкі вучня забяспечваецца яго ўключэннем у актыўную практычную і творчую дзейнасць і вызначаецца зменамі, якія адбываюцца ў сацыяльна-асобасным развіцці вучняў. У адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам павінны быць адлюстраваны наступныя вынікі дзейнасці вучняў:

5.1. асобасныя вынікі:

усведамленне сваёй ідэнтычнасці як грамадзяніна Беларусі на аснове ведаў па гісторыі і асноў культурнай спадчыны беларускага народа;

засваенне гуманістычных і дэмакратычных традыцый і каштоўнасцей сучаснага грамадства, павага да правоў і свабоды чалавека;

асэнсаванне сацыяльна-маральнага досведу папярэдніх пакаленняў, здольнасць да вызначэння сваёй пазіцыі і адказных паводзін у сучасным грамадстве праз вывучэнне такіх гістарычных сітуацый, як захаванне гістарычнай памяці аб асобах і падзеях беларускай мінуўшчыны;

фарміраванне павагі да светапогляду, гісторыі, культуры, рэлігіі, традыцый і каштоўнасцей свайго народу на аснове вывучэння яго духоўнай спадчыны;

5.2. метапрадметныя вынікі:

здольнасць свядома арганізоўваць і рэгуляваць сваю навучальную дзейнасць;

валоданне ўменнямі працаваць з вучэбнай і дадатковай інфармацыяй (аналізаваць і абагульняць факты, састаўляць просты і разгорнуты планы, канспект, фармуляваць і абгрунтоўваць вынікі), выкарыстоўваць сучасныя крыніцы інфармацыі, у тым ліку матэрыялы сродкаў масавай інфармацыі (далей – СМІ) і змешчаныя на электронных носьбітах;

здольнасць вырашаць творчыя задачы, прадстаўляць вынікі сваёй дзейнасці ў розных формах (паведамленне, малюнак, сачыненне, фотарэпартаж, іншыя формы);

гатоўнасць да супрацоўніцтва з аднакласнікамі, калектыўнай працы, засваення асноў узаемадзеяння ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі і сацыяльным асяроддзі;

валоданне ўменнямі атрымліваць і сістэматызаваць інфармацыю з розных крыніц, у тым ліку СМІ, раскрываючы яе сацыяльную прыналежнасць і пазнавальную каштоўнасць;

5.3. прадметныя вынікі:

авалоданне цэласнымі ўяўленнямі пра гістарычны шлях беларускага народа на працягу IX ст. – 1569 г., разуменне асноў фарміравання грамадскіх адносін на беларускіх землях ва ўказаны перыяд;

здольнасць ужываць паняційны апарат культурна-гістарычных ведаў і прыёмы культурна-гістарычнага аналізу для раскрыцця сутнасці і значэння падзей і з’яў эпохі Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу і іх сувязі з сучаснасцю;

пашырэнне досведу ацэнкавай дзейнасці на аснове асэнсавання жыцця і дзеянняў асоб;

гатоўнасць ужываць гістарычныя веды для выяўлення і захавання гістарычных і культурных помнікаў Беларусі, створаных у вывучаемую эпоху.

6. У працэсе рэалізацыі зместу дадзенай вучэбнай праграмы педагагічны работнік можа выкарыстоўваць наступныя формы і метады навучання і выхавання: праца з гістарычным слоўнікам, каментаванае чытанне, складанне аповеду пра гістарычныя падзеі, мультысэнсорнае асэнсаванне карціны, падрыхтоўка сачыненняў, паведамленняў, мадэляванне, гульня, праца з гістарычнай картай, выкарыстанне рэсурсаў глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт (далей – Інтэрнэт-рэсурсаў), прэзентацыя з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, праектная дзейнасць, сустрэчы з творчымі і навуковымі дзеячамі, экскурсіі, абмеркаванні, іншыя формы і метады навучання і выхавання.

У канцы навучальнага года праводзяцца абагульняючыя заняткі, якія даюць магчымасць на прыкладзе сучаснага мастацтва (выяўленчага, архітэктурнага, музычнага, літаратурнага) асэнсаваць ролю духоўнай спадчыны беларускага народа, створанай на працягу IX ст. – 1569 г. у сучаснай Беларусі.

Прапанаваныя творчыя работы маюць варыятыўны характар і педагагічны работнік па жаданні можа змяняць іх змест. Творчыя работы выконваюцца падчас правядзення заняткаў ці прапаноўваюцца вучням у якасці самастойнай работы.

7. У выніку засваення дадзенай вучэбнай праграмы вучні павінны:

7.1. ведаць:

значэнне паняццяў: духоўная спадчына, культурна-гістарычнае асяроддзе, духоўная культура, абрады, духоўная сфера, грамадства, прырода, народны каляндар, скульптура, міфалогія, пісьмовыя помнікі, вусная народная творчасць, шматбожжа, язычніцтва, хрысціянства, мітраполія, гістарычныя крыніцы, летапіс, бяроста, пісала, пергамент,

рукапісныя кнігі, скрыпторый, мініяцюра, кірыліца, глаголіца, промыслы, рамяство, тапаніміка, народнасць, раманскі стыль, гатычны стыль, вежа-данжон, кастэль, храм, народны касцюм, геральдыка, герб, народнае дойлідства, рэстаўрацыя, замак, палац, кансервацыя, помнік;

культурныя працэсы, якія праходзілі на беларускіх землях у дахрысціянскі перыяд; значнасць хрысціянства ў станаўленні і развіцці беларускіх зямель; шляхі распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях; ролю асобы (князей, баяр, гараджан і сялян) у развіцці духоўнасці народа; пісьмовыя помнікі Беларусі IX ст. – першай паловы XVI ст., гісторыю развіцця пісьменства на беларускіх землях; асаблівасці і значэнне старабеларускай мовы, моўную культуру беларускага народа;

асаблівасці развіцця архітэктуры на Беларусі ў дачыненні да светапогляду насельніцтва беларускіх зямель перыяду Сярэдневякоўя і Ранняга Новага часу, яе роля ў захаванні культурнай спадчыны беларусаў, асноўныя віды і жанры беларускага фальклору, фальклорную спадчыну беларусаў;

традыцыйны светапогляд беларусаў; уяўленні жыхароў беларускіх зямель пра навакольны свет; віды гістарычных крыніц і іх ролю ў захаванні духоўнай спадчыны беларусаў; былінны эпас, віды беларускіх народных казак; гісторыю ўзнікнення геаграфічных назваў, культавага дойлідства Беларусі, помнікі, прысвечаныя асобам і падзеям мінулага на тэрыторыі Беларусі;

асаблівасці распаўсюджвання праваслаўя і каталіцтва на беларускіх землях і іх ролю ў жыцці насельніцтва ВКЛ, іх уплыў на фарміраванне духоўнай спадчыны беларускага народа;

7.2. умець:

характарызаваць духоўную спадчыну беларусаў, сакральны характар стаўлення беларусаў да прыродных з’яў, гістарычнае паходжанне і культуру беларусаў, працэс станаўлення старабеларускай мовы і яе асаблівасці, працэс развіцця кніжнага мастацтва і яго спадчыну на беларускіх землях, уплыў этнічных меншасцяў на развіццё беларускіх зямель;

прыводзіць прыклады: нематэрыяльнай спадчыны беларускага народа, культа прыродных аб’ектаў, назваў месяцаў, што адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці сезонаў года, назвы сінкрэтычных рэлігійных святаў, помнікаў пісьменства і вызначаць почырк іх напісання, прыклады раманскіх і гатычных помнікаў дойлідства;

вызначаць ролю чалавека ў стварэнні духоўных каштоўнасцей, значэнне старабеларускай мовы ў развіцці культуры і самабытнасці беларускага народа, сувязь чалавека з навакольным асяроддзем, значэнне промыслаў і рамёстваў, народнага дойлідства ў фарміраванні духоўнай спадчыны беларусаў, уклад асветнікаў у развіццё духоўнай культуры; асэнсоўваць беларускія народныя казкі з пункту гледжання захавання духоўнай спадчыны беларусаў;

прыводзіць прыклады замкаў, якія падлягаюць рэстаўрацыі, кансервацыі; вызначаць ролю гісторыка-культурнай спадчыны ў далейшым развіцці беларускай культуры;

працаваць з пісьмовымі крыніцамі; складаць тэкставае апісанне гістарычнага развіцця сваёй мясцовасці; выкарыстоўваць дадатковы матэрыял з дапамогай Інтэрнэт-рэсурсаў.

8. Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае вывучэнне гістарычнага адрэзку часу з IX стагоддзя да 1569 года. Гэта перыяд узнікнення першых дзяржаў на тэрыторыі Беларусі, фарміравання беларускай народнасці, самабытнай беларусскай культуры. Той гістарычны час быў багаты важнымі падзеямі. Сярод іх распаўсюджванне хрысціянства, стварэнне выдатных помнікаў пісьменства, архітэктуры і мастацтва, шматлікія з якіх з’яўляюцца ўнікальнымі элементамі духоўнай спадчыны не толькі для Беларусі, але і ўсяго славянскага свету.

У матэрыяльнай культуры (архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве) знайшлі ўвасабленне светапогляд тагачасных людзей, пэўная сімволіка, духоўны свет людзей у цэлым – гэта і дазваляе разглядаць дадзеную тэматыку на факультатыўных занятках «Духоўная спадчына Беларусі (IX ст. – 1569 г.)».

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ
(35 гадзін)

Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| УВОДЗІНЫ (2 гадзіны) | | |
| 1 | Духоўная спадчына нашых продкаў – падмурак сучаснай Беларусі | 1 |
| 2 | Чалавек – творца і носьбіт духоўнасці | 1 |
| РАЗДЗЕЛ I. ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТ. (15 гадзін) | | |
| 3 | Гістарычныя крыніцы аб духоўным жыцці насельніцтва Беларусі ў IX – сярэдзіне XIII ст. | 1 |
| 4 | Чалавек і прырода ў духоўнай культуры насельніцтва беларускіх зямель | 1 |
| 5 | Чалавек і гаспадарка ў сувязі з духоўнымі традыцыямі насельніцтва беларускіх зямель | 1 |
| 6 | Правілы жыцця ў побыце беларусаў як адлюстраванне іх духоўных традыцый | 1 |
| 7 | Загадкі геаграфічных назваў Беларусі. Тапанімічная спадчына | 1 |
| 8 | Хрысціянства – аснова духоўнай спадчыны Беларусі | 2 |
| 9 | Чалавек і свет у хрысціянскай духоўнай спадчыне насельніцтва беларускіх зямель | 2 |
| 10 | Духоўны подзвіг першых хрысціянскіх асветнікаў на беларускіх землях | 2 |
| 11 | Першыя хрысціянскія храмы на беларускіх землях. Увасабленне духоўных традыцый беларусаў у архітэктуры | 2 |
| 12 | Уклад полацкіх князёў у фарміраванне духоўнай спадчыны беларускага народа | 1 |
| 13 | Духоўны свет беларусаў у адлюстраванні казак і былін нашых продкаў | 1 |
| РАЗДЗЕЛ II. ДУХОЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ ВКЛ (СЯРЭДЗІНА XIII СТ. – 1569 Г.) (18 гадзін) | | |
| 14 | Паходжанне назвы «Белая Русь» | 1 |
| 15 | Старабеларуская мова – дзяржаўная мова ВКЛ і носьбіт духоўнай спадчыны беларусаў | 1 |
| 16 | Мастацтва сярэдневяковай кнігі | 1 |
| 17 | Культура этнічных меншасцяў у ВКЛ | 1 |
| 18 | Духоўнае жыццё хрысціянскіх вернікаў у ВКЛ як уклад у духоўную спадчыну беларусаў | 2 |
| 19 | Раманскі стыль у замкавым будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі | 2 |
| 20 | Гатычны стыль у царкоўным будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі | 2 |
| 21 | Беларускі народны касцюм | 1 |
| 22 | Геральдыка беларускіх гарадоў | 1 |
| 23 | Беларускае народнае дойлідства як адлюстраванне духоўнага свету беларусаў | 1 |
| АБАГУЛЬНЯЮЧЫЯ ЗАНЯТКІ (5 гадзін) | | |
| 24 | Захаванне гістарычнай памяці аб асобах і падзеях беларускай мінуўшчыны | 4 |
| 25 | Падагульненне вывучанага | 1 |

### УВОДЗІНЫ (2 гадзіны)
Духоўная спадчына нашых продкаў – падмурак сучаснай Беларусі
(1 гадзіна)

Што такое духоўная спадчына. Духоўная культура і яе асаблівасці. Культурна-гістарычнае асяроддзе сучаснай Беларусі і рэгіёна пражывання (вучобы). Роля гісторыка-культурных ведаў і ўменняў вучняў у захаванні духоўнай спадчыны.

Чалавек – творца і носьбіт духоўнасці (1 гадзіна)

Роля чалавека ў грамадска-гістарычным працэсе стварэння духоўных каштоўнасцяў. Клопат аб росквіце свайго роднага краю як маральны абавязак чалавека. Гістарычная пераемнасць у працэсе захавання духоўных артэфактаў у сям'і.

Творчая работа «Артэфакты на беларускіх землях» (пра каштоўныя рэчы, што сталі духоўнымі святынямі, і рарытэты, якія сведчылі пра неверагодную магутнасць іх уладальнікаў).

Раздзел I. ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ
У IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТ. (15 гадзін)

Гістарычныя крыніцы аб духоўным жыцці насельніцтва Беларусі
ў IX – сярэдзіне XIII ст. (1 гадзіна)

Віды крыніц па духоўнай спадчыне Беларусі IX – сярэдзіны XIII ст.: археалагічныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, вусныя, пісьмовыя. Помнікі эпіграфікі. Помнікі царкоўна-рэлігійнага пісьменства. Берасцяныя граматы як прыклад помнікаў пісьменнасці. Летапісы і іх асноўныя асаблівасці. Агіяграфічная літаратура. Асаблівасці інфармацыі кожнага віда крыніц аб стане духоўнага жыцця нашых продкаў.

Творчая работа: «Сведкі мінуўшчыны на беларускіх землях» (апісаць помнікі эпіграфікі і царкоўна-рэлігійнага пісьменства, саставіць спіс летапісаў з каментарыямі).

Чалавек і прырода ў духоўнай культуры насельніцтва
беларускіх зямель (1 гадзіна)

Каляндарная абраднасць беларусаў. Асаблівасці каляндара на беларускіх землях і яго цыклы. Каляндар, назвы месяцаў і дзён тыдня. Культы і вераванні ўсходнеславянскіх плямёнаў крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, якія рассяліліся на тэрыторыі Беларусі. Паняцце Радзімы. Маці-Зямля.

Творчая работа на адну з тэм: «Родная зямліца, зямля-карміцелька», «Маці – сырая зямля», «Зямля святая, яна наша маці», «Зямля на зіму зварухнулася».

Чалавек і гаспадарка ў сувязі з духоўнымі традыцыямі
насельніцтва беларускіх зямель (1 гадзіна)

Земляробства і жывёлагадоўля як асноўныя віды дзейнасці ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі. Гадавы земляробчы цыкл. Адлюстраванне духоўнасці ў рамесных занятках: дрэваапрацоўчыя рамёствы, кавальства, ганчарства, пляценне, апрацоўка скуры і воўны, ткацтва. Роля палявання, рыбалоўства, збіральніцтва, пчалаводства ва ўмацаванні духоўнасці жыхара сярэдневяковай Беларусі.

Творчая работа: «Дудуткі як музейны комплекс» (па выніках экскурсіі), «Мае продкі займаліся…».

Правілы жыцця ў побыце беларусаў як адлюстраванне
іх духоўных традыцый (1 гадзіна)

Узаемаадносіны паміж родзічамі. Фарміраванне сям’і. Узаемаадносіны бацькоў і дзяцей у сям’і. Культ продкаў. Традыцыі штодзённага жыцця.

Творчая работа: «Харчаванне сялянскай сям’і ў XIII ст.».

Загадкі геаграфічных назваў Беларусі.
Тапанімічная спадчына (1 гадзіна)

Тапаніміка – дысцыпліна, якая вывучае назвы якой-небудзь мясцовасці, краіны. Сувязь тапанімікі з лінгвістыкай, геаграфіяй і гісторыяй. Гістарычныя назвы населеных пунктаў Беларусі як адлюстраванне іх духоўнай спадчыны. Шляхі ўтварэння геаграфічных назваў. Балцкая тапаніміка на тэрыторыі Беларусі. Славянская і балцкая гідранімія.

Творчая работа: «Паходжанне назвы майго населенага пункта».

Хрысціянства – аснова духоўнай спадчыны Беларусі (2 гадзіны)

Карані хрысціянства на беларускіх землях. Хрысціянізацыя беларускіх зямель. Суіснаванне язычніцтва і праваслаўя. Сінкрэтычныя рэлігійныя святы. Праваслаўныя музычныя традыцыі.

Творчая работа: «Унікальныя хрысціянскія святыні беларускіх зямель».

Чалавек і свет у хрысціянскай духоўнай спадчыне насельніцтва беларускіх зямель (2 гадзіны)

Эра ад стварэння свету і раства Хрыстова. Асаблівасці летазлічэння ва ўсходніх славян. Юліянскі і грыгарыянскі каляндары. Жыццё сярэдневяковага чалавека ва ўяўленнях веруючых.

Творчая работа: «Каляндар рэлігійных свят».

Духоўны подзвіг першых хрысціянскіх асветнікаў на беларускіх землях (2 гадзіны)

Прападобная Еўфрасіння, ігуменя Полацкая: выбар жыццёвага шляху, асветніцкая і рэлігійная дзейнасць. Крыж Еўфрасінні Полацкай: стварэнне і лёс, сучасны вобраз. Свяціцель Кірыл, епіскап Тураўскі: подзвіг пустэльніка, выдатны пісьменнік і прамоўца. Вядомыя асветнікі, рэлігійныя і грамадскія дзеячы – Аўрамій Смаленскі і Клімент Смаляціч.

Творчая работа: «Ушанаванне памяці беларускіх асветнікаў у розных відах мастацтва: скульптура, жывапіс, літаратура» (аб адным з асветнікаў).

Першыя хрысціянскія храмы на беларускіх землях. Увасабленне духоўных традыцый беларусаў у архітэктуры (2 гадзіны)

Візантыйская традыцыя і крыжова-купальныя храмы. Полацкая школа дойлідства: Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнская царква. Дойлід Іаан. Тураўскі храм. Гродзенская школа дойлідства: Барысаглебская (Каложская) царква.

Творчая работа: «Вядомыя помнікі культавай архітэктуры Беларусі перыяду Сярэдневякоўя».

Уклад полацкіх князёў у фарміраванне духоўнай спадчыны беларускага народа (1 гадзіна)

Полацкае княства – дзяржава ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі. Князь Ізяслаў – пачынальнік дынастыі полацкіх князёў. Умацаванне полацкай дзяржаўнасці пры князе Брачыславе. Полацкі князь Усяслаў Брачыслававіч: легендарнае паходжанне Чарадзея і веліч дзяржавы. Асветніцка-культурная дзейнасць полацкіх князёў.

Творчая работа: Генеалагічнае дрэва «Род Ізяславічаў».

Духоўны свет беларусаў у адлюстраванні казак і былін нашых продкаў (1 гадзіна)

Быліны, іх месца ў культуры. Паходжанне і віды былін. Быліны як літаратурны фальклорны твор. Увасабленне ў вобразе быліннага Волха Усяславіча постаці гістарычнай асобы Усяслава Полацкага. Сухман Адзіхманцьевіч – былінны вобраз князя Даўмонта. Беларускія казкі і іх віды.

Творчыя работы: «Ствараем любімага быліннага (казачнага) героя».

«Інсцэніроўка беларускай казкі». «Складаем уласную казку ці быліну».

Раздзел ІІ. ДУХОЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ ВКЛ (СЯРЭДЗІНА XIII СТ. – 1569 Г.) (18 гадзін)

Паходжанне назвы «Белая Русь» (1 гадзіна)

Асноўныя канцэпцыі (тэорыі) паходжання назвы «Белая Русь». Змены ў лакалізацыі назвы «Белая Русь». Саманазвы насельніцтва беларускіх зямель.

Творчая работа: «Саманазвы насельніцтва беларускіх зямель».

Старабеларуская мова – дзяржаўная мова ВКЛ і носьбіт духоўнай спадчыны беларусаў (1 гадзіна)

Мова як аснова культуры і духоўнай самабытнасці беларускага народа. Уплыў мовы на развіццё асобы. Умовы развіцця старабеларускай мовы. Асаблівасці старабеларускай мовы. Яе значэнне ў перадачы духоўнай спадчыны беларусаў.

Творчая работа: Старабеларускі даведнік «Жыццё гараджан ВКЛ».

Мастацтва сярэдневяковай кнігі (1 гадзіна)

Рукапісная кніга як духоўная з'ява. Майстэрні па стварэнні кніг. Манастыры як цэнтры перапісвання кніг. Кніжная мініяцюра. Асноўны почарк кнігапісцаў (устаў, скорапіс). Выяўленча-дэкаратыўныя элементы афармлення кніг (ініцыялы, застаўка). Кніжныя жанры і стылі (старавізантыйскі, звярыны, балканскі, гатычны, іншыя). Захаваўшаяся кніжная спадчына.

Творчыя работы: «Стылізацыя элементаў жывёльнага свету ў выглядзе кніжнай мініяцюры». «Кніжная графіка» (эскіз уласнай кніжнай аправы).

Культура этнічных меншасцяў у ВКЛ (1 гадзіна)

Татары, палякі, яўрэі, цыганы: з'яўленне на тэрыторыі ВКЛ, звычаі і заняткі. Сумеснае пражыванне этнічных меншасцяў з беларускім этнасам: запазычванне мясцовых традыцый і захаванне арыгінальнасці. Уклад энічных меншасцей у фарміраванне духоўнай спадчыны беларускіх зямель.

Творчая работа: «Традыцыі, звычаі і заняткі этнічных меншасцяў Беларусі на сучасным этапе развіцця краіны».

Духоўнае жыццё хрысціянскіх вернікаў у ВКЛ як уклад у духоўную спадчыну беларусаў (2 гадзіны)

Становішча праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла на беларускіх землях. Праваслаўе і каталіцтва ў жыцці насельніцтва ВКЛ. Абрады і таінствы. Рэлігійная талерантнасць і яе праяўленне ў сучаснай Беларусі. Фарміраванне беларускай іканапіснай школы, яе спадчына сёння.

Творчая работа: «Значэнне і роля праваслаўных і каталіцкіх храмаў у гісторыі Беларусі» (малюнак (макет) каталіцкага ці праваслаўнага храма).

Раманскі стыль у замкавым будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі (2 гадзіны)

Перадумовы з'яўлення раманскага стылю ў Еўропе і ВКЛ. Асаблівасці раманскага стылю на беларускіх землях. Перыяд «абарончага дойлідства». Будаўніцтва вежаў-данжонаў. Камянецкая вежа. Замкі-кастэлі. Навагрудскі замак. Лідскі замак – адзін з самых вялікіх замкаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Крэўскі замак. Гродзенскі замак Вітаўта. Сённяшні стан раманскай архітэктурнай спадчыны.

Творчыя работы: «Сярэдневяковы замак» (макет замка ці вежы-данжона). Лэпбук «Раманскія помнікі дойлідства на тэрыторыі Беларусі».

Гатычны стыль у царкоўным будаўніцтве на тэрыторыі Беларусі (2 гадзіны)

Распаўсюджванне готыкі ў ВКЛ. Асаблівасці готыкі на беларускіх землях. Абарончыя храмы як сістэма гарадскіх умацаванняў ці асобныя кропкі абароны ў вясковых ваколіцах. Фартыфікацыйныя функцыі беларускіх сярэдневяковых храмаў. Характар будаўнічага матэрыялу (вялікапамерная цэгла) і канструкцыйныя адрозненні мураваных гатычных касцёлаў ВКЛ ад узораў заходнееўрапейскай каменнай готыкі. Гатычная альбо вендская (балтыйская) сістэма муроўкі. Навагрудскі касцёл. Касцёл Св. Яна Хрысціцеля (в. Камаі, Віцебская вобласць), Касцёл Прасвятой Троіцы (в. Ішкалдзь, Брэсцкая вобласць).

Творчая работа: Пазл «Гатычны храм».

Беларускі народны касцюм (1 гадзіна)

Мужчынская і жаночая вопратка: элементы і прызначэнне. Жаночыя ўпрыгажэнні. Колер адзення і яго значэнне. Народны касцюм у музейных зборах Беларусі.

Творчая работа: «Жаночы і мужчынскі касцюмы жыхароў ВКЛ і яго асобныя элементы».

Геральдыка беларускіх гарадоў (1 гадзіна)

З'яўленне геральдычных сімвалаў. Геральдыка. Герольд. Гарадская геральдыка. Функцыянальныя і штучныя гербы. Геральдычная спадчына часоў ВКЛ у гербах гарадоў сучаснай Беларусі.

Творчая работа: Лэпбук «Геральдычная спадчына».

Беларускае народнае дойлідства як адлюстраванне
духоўнага свету беларусаў (1 гадзіна)

Адлюстраванне ў дойлідстве тыповых абставін, агульных ідэй народа. Беларускае народнае дойлідства як этнакультурны комплекс. Этнічная спецыфіка беларускага народнага дойлідства. Традыцыйнае жыллё, інтэр'ер, дэкор. Гаспадарчыя і вытворчыя збудаванні. Народнае дойлідства і прырода. Адлюстраванне духоўнай спадчыны беларусаў у народным дойлідстве.

Творчая работа: «Беларускае жытло эпохі ВКЛ».

АБАГУЛЬНЯЮЧЫЯ ЗАНЯТКІ (5 гадзін)

Захаванне гістарычнай памяці аб асобах і падзеях
беларускай мінуўшчыны (4 гадзіны)

Роля Дзяржаўнай праграмы «Замкі Беларусі» на 2012–2018 гады, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2012 г. № 17, ў захаванні, аднаўленні і рацыянальным выкарыстанні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Помнікі ў сучаснай Беларусі, прысвечаныя асобам і падзеям мінулага (помнік Давыду Гарадзенскаму ў Гродна, помнікі Ізяславу і Рагнедзе ў Заслаўі, помнікі Анастасіі Слуцкай у Слуцку, Альгерду ў Віцебску, Вітаўту ў в. Пеляса Гродзенскай вобласці і Гродна, Усяславу Чарадзею у Полацку, Кірылу Тураўскаму ў Гомелі і Тураве, помнікі Сімяону Полацкаму і Еўфрасінні Полацкай у Полацку, іншыя помнікі).

Творчая работа: «Фэст экскурсаводаў».

Падагульненне вывучанага (1 гадзіна)

Арганізацыя выставы лепшых малюнкаў і фатаграфій, макетаў архітэктурных пабудоў, паведамленняў і сачыненняў вучняў.

Гульня-віктарына «Ці ведаеце вы гісторыка-культурную спадчыну свайго краю?».